# ПЕРАКАЗ ЯК ВІД ПІСЬМОВАЙ ПРАЦЫ ПА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Савікава Ганна Юр'еўна
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна"

Пераказ – гэта пісьмовая праца, якая змяшчае змест прачытанага або пачутага, стварэнне тэксту на аснове дадзенага (зыходнага). Пераказ выкарыстоўваецца:

–для навучання логіцы і кампазіцыі тэксту;

–для развіцця такіх разумовых аперацый як аналіз, сінтэз, вылучэнне галоўнага, абстрагаванне ад менш істотнага;

–для ўзбагачэння слоўніка, фразеалогіі, граматыкі;

–для навучання жанраў – апавядання, апісання і разважання, стыляў – мастацкакга, навуковага, публіцыстычнага;

–для выхавання на матэрыяле твораў.

У аснове пераказу ляжыць перайманне ўзору (імітацыйны метад навучання). Аднак пераказ дае вучням магчымасць самастойнай творчасці. Праца з узорам мастацкіх, публіцыстычных тэкстаў станоўча ўплывае на эмацыйную сферу, вучыць адчуваць тэкст, развівае адноўленае і творчае ўяўленне, дапамагае вырашэнню задач выхавання, пашырае кругагляд.

Аналіз школьнікаў зыходнага тэксту, яго тэмы, ідэі, кампазіцыйных і моўных асаблівасцяў і наступнае яго ўзнаўленне фарміруе ў вучняў такія камунікатыўныя ўменні, як: 1) уменне раскрываць тэму і асноўную думку выказвання; 2) уменне збіраць і сістэматызаваць матэрыял да выказвання; 3) уменне планаваць і ствараць выказванне з улікам яго задачы, тэмы, асноўнай думкі; 4) уменне будаваць маналагічныя выказванні розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў (апісанне, апавяданне, разважанне).

Віды пераказаў і іх класіфікацыя. Спецыяльна пытанне аб кваліфікацыі пераказаў у методыцы разглядалася Я.А. Баранавай, якая прапануе дзяліць пераказ па трох падставах: 1) па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя); 2) паводле характару тэкставага матэрыялу (апавядальнага характару, з элементамі разважання, тыпу разважання, тыпу характарыстыкі інш.); 3) па спосабе перадачы зместу (ізлажэнні поўныя або падрабязныя, блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, з элементамі сачынення).

Т.А. Ладыжанская лічыць, што пераказы адрозніваюцца таксама па ўспрыманні зыходнага тэксту: пераказ прачытанага (успрынятага зрокава), пачутага (успрынятага на слых), успрынятага і на слых і зрокава.

З мэтай актывізацыі ўжывання ў маўленні вучняў пэўнай граматычнай катэгорыі мэтазгодна праводзіць і ізлажэнні-мініяцюры. Практыкаванні такога роду, разлічаныя на 10-15 хвілін, як раз і ставяць у якасці галоўнай

задачы ўвядзенне ў актыўную мову (маўленне) школьнікаў тых ці іншых граматычных сродкаў.

Разгледжаныя віды пераказаў па-рознаму развіваюць разумовую дзейнасць вучня. У працэсе аналітыка-сінтэтычнай працы пры падрабязным пераказе ідзе асэнсаванне часавых, прычынна-ўмоўных, прасторавых адносін. Пры выбарачным і сціснутым узнаўленні тэксту вучні вылучаюць адну частку матэрыялу і адыходзяць ад іншай, што развівае такую разумовую аперацыю, як абстрагаванне, спрыяе актыўнасці і выбіральнсці мыслення. Пераказы з творчым заданнем развіваюць уяўленне і актывізуюць творчую думку школьніка.

Паслядоўнасць і логіка развіцця тэмы, яе сэнсавая закончанасць забяспечваецца працай над планам і наступным выкарыстаннем яго ў якасці нагляднай апоры. Віды плана, якія могуць быць прапанаваны школьнікам на ўроках развіцця маўлення, розныя – малюнкавы план да кожнага сказа тэксту, серыя сюжэтных малюнкаў, асабныя часткі агульнага малюнка, карцінна-сімвалічны і слоўны планы. Праца над змястоўным і моўным бакамі тэксту ажыццяўляецца адначасова. Калектыўна абмяркоўваюць кожны пункт плана і гэтак жа калектыўна выпраўляюць стылістычныя памылкі ў афармленні тэксту. Неабходна адпрацоўваць пачатак апавядання, які заўседы выклікае цяжкасці ў вучняў. Паколькі ў пачатковай школе ўсе творчыя працы з’яўляюцца навучальнымі, дзецям дазваляецца карыстацца арфаграфічнымі слоўнікамі, рабочымі сшыткамі, у якіх яны на папярэдніх уроках запісвалі словы і выразы па тэме.

Этапы працы над пераказам:

1. Першае чытанне тэксту (дзеці складаюць прыблізны план на чарнавіку).
2. Абмеркаванне пытання аб тыпе тэксту і яго тэме.
3. На якія часткі дзеліцца тэкст (рэдагаванне складзенага вучнямі плана)?
4. Пра што гаворыцца ў кожнай з частак? Які можна даць загаловак?
5. Лексіка-арфаграфічная падрыхтоўка: папярэджванне лексічных і арфаграфічных памылак.
6. Выбар ключавых слоў у адпаведнасці з тыпам тэксту.
7. Распаўсюджанне ключавых слоў у адпаведнасці з тыпам тэксту (прыметнікамі, калі гэта апісанне, і дзеясловамі, калі апавяданне).
8. Другое чытанне тэксту (дзеці дапаўняюць план).
9. Абмеркаванне выразных сродкаў тэксту: якія параўнанні, эпітэты выкарыстоўвае аўтар.
10. Папярэджанне маўленчых памылак: якія сінонімы можна выкарыстоўваць, каб словы не паўтараліся? Якое слова можна выкарыстоўваць? Якое значэнне асобных слоў?

11. Папярэджанне арфаграфічных памылак: запіс на дошцы і абмеркаванне новых і цяжкіх слоў.
12. Трэцяе чытанне тэксту. Або / і: вусны пераказ тэксту (або яго часткі)адным з вучняў.
13. Абмеркаванне межаў мікратэмаў тэксту (вылучэнне абзацаў).
14. Напамін аб знаках прыпынку.
15. Запіс тэксту вучнямі са зваротам да слоўніка.